**Друк Г. М. (Мінск)**

# КАНЦЭПЦЫЯ САМАЎСВЕДАМЛЕННЯ АСОБЫ Ў “КРУТЫМ МАРШРУЦЕ” Я. ГІНЗБУРГ І “СПОВЕДЗІ” Л. ГЕНІЮШ

Звыклым стала ўяўленне, што аўтар аўтабіяграфічнага твора максімальна захоўвае праўдзівасць, даставерна падае факты, не выдумляе і не фантазіруе. І тым не менш, пры вывучэнні такой літаратуры мы памятаем пра тое, што ёсць асаблівасці адбору і кампанавання фактаў з жыццёвага вопыту, яго пэўныя суадносіны з мастацкім вымыслам. Даследчык В.Стральцова слушна адзначае, што адкрытая размова пісьменніка з чытачом у выніку “пакутлівага роздуму, спакусы, выбару” – гэта новы “шлях да самога сябе” [4, с. 111]. А іменна, аўтабіяграфічны твор выяўляе пэўную канцэпцыю самаўсведамлення асобы, даследаванне якой патрабуе ад нас вызначыць аб’ектыўныя і суб’ектыўныя фактары, што паўплывалі на мастацкі змест і жанравую прыроду адпаведнага тэксту.

Творы гулагаўскай тэматыкі “Споведзь” Л.Геніюш і “Круты маршрут” Я.Гінзбург – адзін з яркіх прыкладаў працэсу самапазнання творчай асобы і яго рознага адлюстравання, нягледзячы на падабенства жыццёвай сітуацыі. І гэта падабенства не толькі ў наяўнасці лагернага вопыту, але і ў трагічнасці індывідуальнага чалавечага лёсу. Найперш як жанчыны-маці, якая страшна перажывала гвалтоўны акт па пазбаўленні яе жаночай сутнасці, у прыватнасці, мацярынскіх інстынктаў. Жаданнем напісаць твор Я. Гінзбург упершыню падзялілася з сынам падчас іх сустрэчы ў Магадане ў кастрычніку 1948 г., спадзеючыся, што ён зразумее становішча маці і асэнсуе прычыны свайго сіроцкага дзяцінства. Разлучаная з дзецьмі і сям’ёй, зведаўшы турэмна-лагернае пекла, аўтар задумала расказаць пра свае пакуты як адлюстраванне лёсу ўсіх “добрых людзей” і “сапраўдных камуністаў” [2, с. 9], што сталі ахвярай сталінскага рэжыму. Шчодра надзеленая дарам слова і ўласцівай творчаму чалавеку назіральнасцю, яна адчула магчымыя непаразуменні з новым пакаленнем, якое па-рознаму ставілася да жахлівага вопыту той эпохі, таму акрэсліла ідэю сваіх запісак як “пісьмо да ўнука” [2, с. 9]. У канцы кнігі Я. Гінзбург скажа, што ёй давялося сутыкнуцца з жаданнем некаторых людзей усё забыць, жыць без усякай пераацэнкі каштоўнасцяў у сувязі з падзеямі сталінскіх часоў. Таму значэнне кнігі яна бачыла і ў тым, каб “наши национальный позор и ужас не повторились” [2, с. 824].

У Л. Геніюш асабістае і грамадска-нацыянальнае ад самага пачатку суіснуюць разам: цэнтральным канцэптуальным вобразам “Споведзі” бачыцца мастацкі вобраз маці, якая просіць даравання ў свайго адзінага дзіцяці з прычыны таго, што яна мусіла ў сілу абставін стаць Маці для ўсіх пакрыўджаных і безабаронных: “Даруй, малы пакінуты юнак, даруй, мой сын… Хачу, каб некалі ты зразумеў мяне, каб дараваў свае мучэньні. Не было ў мяне выбару, сын, – Бацькаўшчына і яе інтарэсы важней за цябе, за

мяне, за нашага тату… [1, с. 124]. Хутка зразумеўшы сутнасць савецкай сістэмы, яна рабіла ўсё магчымае, каб вярнуць лагернікам веру ў тое, што яны – не “ворагі народа”, а насамрэч лепшыя за ўсіх, хто арыштоўваў, дапытваў, ганьбіў, прыніжаў, знішчаў. За чалавечнасць, людскасць і мужнае цярпенне, ахвярнасць зняволеныя “ахрысцілі” яе “Маці”. Словам, вобраз маці ў творы Л. Геніюш з індывідуальна-асабістага вырастае ў рэлігійна-філасофскі.

Бадай што аднолькавай з’яўляецца ў абедзьвюх аўтарак мэта напісання твора. Па першае, літаратурнае асэнсаванне горкага жыццёвага вопыту дазволіла б зведаць катарсіс, перажыць працэс вяртання ў асяроддзе людзей, свет культуры і цывілізаванасці. Па-другое, чалавек з падобным досведам жыцця, які паважае сябе як асобу і творча не абдзелены, заканамерна імкнецца да перастварэння перажытага ў праўдзівы дакумент. Падабенства зместу кніг існуе ў выяўленні свайго часу як вар’яцкага і катастрафічнага, выкрыцці палітычнага рэжыму з яго устаноўкай на вынішчэнне чалавечых каштоўнасцяў, паказе ненармальных лагерных умоваў існавання. Л. Геніюш і Я. Гінзбург умеюць выкарыстоўваць назіранні над штодзённым жыццём у мастацкіх мэтах, псіхалагічна і эмацыянальна завастраць аповед праз выбар эпізодаў, аўтарскі каментарый з маральнай ацэнкай той ці іншай гісторыі, стылёвае афармленне аповеду. Звярнуўшыся да аднаго вобраза і ўкладваючы ў яго аднолькавы сэнс, аўтары тым не менш па-рознаму выказаліся пра галоўны аб’ект сваіх назіранняў: чалавек у лагеры ва ўспрыманні Я. Гінзбург – “непрачытаная кніга” [2, с. 494], па вызначэнні Л. Геніюш, “тут чалавек – адкрытая кніжка, адзін другога ведае наскрозь” [1, с. 120].

Відавочна, што формай унутранага супраціўлення сістэме становіцца не толькі крытычнае мысленне, цвярозае жаданне разабрацца ў сітуацыі, чалавеку і ў трансфармацыях яго псіхікі ў лагеры, але і мастацкая творчасць. Абвостранае адчуванне пошуку душэўных сіл прыводзіць гераіню “Крутога маршруту” да высновы, што каштоўнасць паэзіі па-сапраўднаму правяраецца менавіта ў такія моманты жыцця [2, с. 158]. Яна часта “прымярае” выяўлены ў творах эстэтычны настрой розных аўтараў да свайго становішча, перажыванняў, думак, спрабуе сама пісаць вершы, падкрэсліваючы такім чынам дысгармонію ўласнага лёсу – лёсу асобы, адарванай ад агульнай плыні нармальнага жыцця. Літаратурная роля Л. Геніюш у “Споведзі”, наадварот, – роля нацыянальнага паэта, біяграфія якога звязана з перыпетыямі беларускай гісторыі, а логіка яго характару адпавядае традыцыйнаму мастацкаму архетыпу – праўдашукальніка, асветніка, бунтаўшчыка, змагара. Паводле Т.М. Тарасавай, “спроба згарманізаваць жорсткі знешні свет і крохкі, чулы ўнутраны падштурхоўвае Л. Геніюш заняць пазіцыю філосафа-стоіка…” [5, с. 96]. Трываць на гэтай пазіцыі ёй дапамагае глыбокая вера ў Бога, унутраная культура, уласная творчасць, якую зняволеныя ахрысцілі “глюкозай”, шырыня гістарычнага мыслення.

Можна сказаць, што ў поглядзе аўтара “Крутога маршруту” дамінуюць не нацыянальныя, а ідэалагічныя ўяўленні. Асаблівасць зместу кнігі

Я. Гінзбург у паказе ролі, месца, рэакцыі камуністычнага партыйнага асяроддзя, з якога была і сама пісьменніца, і ацэнках лагерных падзей у адпаведнасці з гэтым грамадскім статусам. Невыпадкова асобныя месцы кнігі выклікалі нават нязгоду ў былых зняволеных, якія разам з Я. Гінзбург знаходзіліся ў адзін перыяд у лагеры. Напрыклад, Б.Н. Лесняк адзначае некаторую ўстаноўку аўтара на свядомы вымысел, на скажэнне праўдзівага факта дзеля мастацкай задачы – паслядоўнае тварэнне героя-“страстотерпца” [3]. Як вынік такога рознага падыходу – абсалютна розныя грамадзянскія пазіцыі ў пісьменніц: Л. Генюш не прыняла савецкага грамадзянства пасля вяртання з лагераў, Я. Гінзбург аднавілася ў партыі, нягледзячы на тое, што ўбачыла сапраўднае аблічча камунізму.

Назіраецца яшчэ адно адрозненне ў раскрыцці некаторых асаблівасцяў вобраза асобы. Псіхалагічна супярэчлівай успрымаецца гераіня “Крутога маршруту” асабліва тады, калі прасачыць рэалізацыю сувязяў рэальнага факта і свядомага вымыслу. Неад’емнай катэгорыяй пры разглядзе гэтага пытання будзе памяць. На працягу ўсяго зместу Я. Гінзбург супярэчліва выказваецца пра сваю памяць: то катэгарычна сцвярджае, што можа ўзгадаць аж фізічна нават кожную ямінку на падлозе турэмнай камеры-адзіночкі, то не менш цвёрда паведамляе, што яе памяць не здольна ўсё ўзнавіць дакладна, то нібы вінаваціцца, што могуць быць недакладнасці ў аповедзе ў сувязі са змяшчэннямі памяці ў часе, то просіць чытача ёй давяраць, запэўніваючы ў адсутнасці кан’юнктурных хадоў. Лёгка зразумець гераіню Л. Генюш, якая не акцэнтуе на гэтым увагі чытача. Толькі аднойчы беларускі аўтар скажа, што, маючы такі эмацыянальны вопыт, натуральна, усяго не згадаеш дакладна. Гэта выглядае лагічна, асабліва калі ўлічыць, якія зрушэнні ў псіхіцы адбываліся ў людзей, што трапілі ў сталінскія лагеры. У якасці высновы можна выказаць гіпотэзу пра своеасаблівы раскол у яе душы, унутраную барацьбу “пісьменніка”, выдатнага гісторыка і “чалавека” як прадстаўніка свайго асяроддзя, што і вызначала “нервовы” характар яе памяці.

Вядомы факт, што над сваёй кнігай Я. Гінзбург працавала доўга, выкідваючы адны факты і замяняючы іх на другія, што першы варыянт рукапісу яна знішчыла, бо ён нёс у сабе яшчэ больш жорсткую праўду пра перажытае. Змест “Споведзі” Л. Генюш не паказвае на духоўныя хістанні аўтара і гераіні: яна застаецца бязлітаснай і праўдзівай, не баіцца выказацца крытычна ў адрас тых людзей, з якімі даводзілася сустракацца, дазваляючы чытачу прымаць яе такой, якой яна ёсць.

Такім чынам, сінтэтычная форма твораў гулагаўскай тэматыкі Л. Генюш і Я. Гінзбург абумоўлена спецыфікай задумы, мэты і задач, якія паставіў перад сабой кожны аўтар. І якія, у сваю чаргу, цесна звязаны як з асабістым трагічным вопытам, так і знешнімі фактарамі, у першую чаргу працэсамі дэмакратызацыі грамадства ў др. палове XX ст. Спецыфіка мастацкага зместу твораў і канцэпцыі асобы таксама дэтэрмінавана фактарамі як знешняга, так і ўнутранага парадку і абумоўлена найперш тым,

што гэтыя аўтары – прадстаўнікі рознага сацыяльнага статусу, светапогляду, розных народаў. Я.Гінзбург паказвае сталінізм як трагедыйную старонку гісторыі рускага народа, як яго вялікую ганьбу, Л. Геніюш – не менш трагічную гісторыю беларускага народа, які вынішчаюць суседнія народы.

**Літаратура**


1. Геніюш, Л.А. Збор твораў у 2 т. Т. 2: Проза. – Рэжым доступу: http://royallib.com/book/geniyush_larisa/zbor_tvora_u_dvuh_tamah_tom_2_proza.html

2. Гинзбург, Е.С. Крутой маршрут: хроника времен культа личности / Е.С.Гинзбург. – М.: Астрель: АСТ, 2010. – 878 с.

3. Лесняк, Б.Н. Я к вам пришел! – Магадан : МАОБТИ, 1998. – 296 с. : ил., портр. - (Архивы памяти ; вып. 2). – Рэжым доступу: http://www.sakharov-center.ru/asfcd/auth/?t=page&num=3300.

4. Стральцова, В.М. Шлях да сябе: Сучас. аўтабіягр. проза як мастацкая сістэма / В.М.Стральцова. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 112 с.

5. Тарасава, Т.М. Гулагаўская тэматыка ў аўтабіяграфічнай прозе // Сучасны літаратурны працэс: тэндэнцыі і праблемы развіцця: дапаможнік / І.М.Гоўзіч, Т.К.Грамадчанка, А.С.Гурская і інш.; пад аг. рэд. Т.К.Грамадчанкі. – Мінск: БДПУ, 2010. – 104 с.